ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! АЎТОРАК, 16 ЖНІЎНЯ 1938 г. № 44 (386) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР



Трыумф совецкай авіяцыі

Перамога соцыялізма ў СССР ёсць рэзультат велізарнейшай барацьбы і перамог нашай ленінска-сталінскай большэвіцкай партыі — перадавога атрада працоўных СССР. У нашай краіне пабудован у асноўным соцыялізм. Перамогшы соцыялізм пранік ва ўсе галіны, ва ўсе поры нашага жыцця, нашага быту. Совецкі народ жыве па-новаму, і гэта надае новыя сілы, энергію і веру ў яшчэ больш цудоўную будучыню. Усё, што звязана з соцыялізмам, з'яўляецца блізкім і родным совецкаму народу, а ўсё варожае яму выклікае нянавісць працоўных і ўспрымаецца як антынароднае. Дзве вялікія сілы — народ і комунізм — злучыліся ў нашай краіне ў адно цэлае і неразрыўнае. Гэта вялікае яднанне — магутная, непераможная апора соцыялістычнай дзяржавы, жалезны фундамент яе магутнасці.

Соцыялізм, перамогшы ў нашай краіне, адкрыў неабсяжныя перспектывы для развіцця сапраўднай перадавой навукі. Створаны, раней ніколі небывалыя, магчымасці для росквіту навукі, «тае навукі, якая не адгараджваецца ад народа і не трымае сябе далёка ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваёвы навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добраахвотна, з ахвотай» **(Сталін).**

Партыя Леніна—Сталіна і совецкі ўрад забяспечылі найвялікшыя магчымасці для навуковай работы ў нашай краіне, для свабоднай навуковай творчасці. Яркае сведчанне гэтага — работа дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс», дзе праяўлен гераізм совецкіх людзей, выхаваных сталінскай эпохай, і паказаны дасягненні совецкай навукі і тэхнікі. Зараз, у сталінскую эпоху, навука ўвайшла ў плоць і кроў народа, заняла належнае ёй месца ў соцыялістычным будаўніцтве, стала служыць інтарэсам вызваленага народа.

Перамога соцыялізма забяспечыла магутнасць доблеснай Чырвонай Арміі, якая зорка ахоўвае непарушнасць граніц Совецкага Саюза і мірную працу грамадзян соцыялістычнага грамадства. Поўны высокага патрыятызма, совецкі народ аднадушна заявіў, што ён гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону сваёй соцыялістычнай радзімы.

Если завтра война, если враг нападет,
Если темная сила нагрянет, —
Как один человек, весь советский народ
За свободную родину станет.

Японская ваеншчына робіць правакацыйныя спробы ўцягнуць Японію ў вайну з СССР. Мы вайны не хочам, але да вайны гатовы. Міжнародная абстаноўка абавязвае нас трымаць порах сухім, а народ у мабілізацыйнай гатоўнасці. Гэтага патрабуюць кроўныя інтарэсы совецкага народа, інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Совецкі Саюз вядзе паслядоўную і непрымірымую барацьбу супроць фашысцкіх падпальшчыкаў вайны. Цвёрда, па-сталінску ён выкрывае замыслы фашысцкіх агрэсараў, раскрывае іх планы і дае бязлітасны адпор іх правакацыям. У вялікай справе барацьбы за мір, развіваючы навуку і культуру, Совецкі Саюз апіраецца на падтрымку ўсяго перадавога чалавецтва.

Совецкая культура стала велізарнай сілай, уздзейнічаючай на культурнае жыццё Захаду. Соцыялістычны характар дасягненняў совецкай навукі і тэхнікі ўжо відавочны для кожнага.

З поваду палёту па першаму сталінскаму маршруту тав. Чкалава маршал англійскай авіяцыі Джон Салюід у 1936 годзе заявіў:

«Пералёт Чкалава і яго спадарожнікаў ядзіўляе чалавечае выабражэнне сваёй велізарнасцю. Цудоўна сіла авіяцыйнай тэхнікі, якая дазваляе перамагаць без перапынку такія найвялікшыя адлегласці, к таму-ж яўна недаступныя для другога віду транспарта».

Аб пералёце Чкалава, Байдукова і Белякова цераз Паўночны полюс у Амерыку французы пісалі:

«63-гадзінны палёт над бязлюднымі краямі, дзе малейшая аварыя магла быць трагічнай, совецкі самалёт вытрымаў бліскуча. Гэта — найвялікшае дасягненне, якое паказвае майстэрства экіпажа і зноў робіць гонар совецкім крыллям».

Колькі было палётаў на Усход! Але ні выдатнаму Посту, ні многім надзвычайным лётчыкам нашай краіны не ўдавалася дабрацца да берагоў Ціхага акіяна за такі кароткі тэрмін. Часць і гонар таварышам Кокінакі Брандзінскаму і канструктару Ільюшыну, якія паставілі Совецкі Далёкі Усход радам з Крэмлём на адлегласць, роўную суткам. Вось чаму ўвесь совецкі народ ганарыцца дасягненнямі экіпажа «Масква».

Усяму свету вядомы бліскучы палёт герояў Совецкага Саюза з Масквы ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Увесь свет захапляўся мужнасцю совецкіх лётчыкаў, якія зрабілі палёт цераз Паўночны Полюс. Усе гэтыя авіяцыйныя дасягненні даюць права совецкаму народу сказаць, што ў гісторыі сусветнай авіяцыі наступіла совецкая эпоха, што Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пачынае займаць і будзе займаць вядучае месца ў авіяцыі свету.

Партыя, урад і асабіста таварыш Сталін прымаюць усе меры, каб Ваенна-Паветраны Флот Совецкага Саюза быў на вышыні, на якой ён абавязан быць.

Наш флот воздушный партией взлелеен,
У наших крыльев — сталинский размах,
Гуди мотор родного самолета,
Взвивайтесь выше, сотни новых птиц!
Чем крепче мужество советского пилота,
Тем неприступней линия границ!

«Я павінен сказаць, што паветраныя сілы не адстаюць ад іншых нашых больш старых родаў войск, а ў сімтым іх апераджаюць» **(Варашылаў).**

Совецкая авіяцыя набліжае нас да вырашэння задач хуткай сувязі з самымі далёкімі раёнамі нашай неабсяжнай краіны, культурнага і гаспадарчага абслугоўвання народаў Совецкага Саюза.

Кожны працоўны ўмацоўвае абараназдольнасць совецкай краіны добрай работай на сваім участку. Пісьменнікам, які выканаў свой абавязак перад радзімай, з'яўляецца той, хто сваім творам фарміруе патрыятычныя пачуцці грамадзяніна соцыялістычнай радзімы, хто стварае вобразы герaічных людзей совецкай краіны. Абароннымі матывамі павінна быць праcякнуты кожны твор совецкага пісьменніка. Нам, знаходзячыся на рубяжы з капіталістычным светам, трэба стварыць магутную абаронную літаратуру, якая выхоўвала-б мільёны совецкіх патрыётаў.

Вялікі майстар соцыялістычнага рэалізма А. М. Горкі гаварыў, што ні адна эпоха не давала такога выключнага багацця тэм, вобразаў, сюжэтаў, якія дае наша рэчаіснасць работнікам мастацтва, пісьменніку, мастаку, актору, архітэктару і т. д.

Пісьменнікі і мастакі павінны ствараць такія мастацкія творы, якія-б адлюстроўвалі веліч сталінскай эпохі, стварылі-б такія кнігі, такія вобразы, каб чытач, прачытаўшы твор і пазнаёміўшыся з яго героямі, сказаў: я хачу быць такім, як героі, створаныя мастаком.

Напісаць творы, вартыя сталінскай эпохі,—вось найпершы абавязак совецкага пісьменніка перад радзімай.

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Совета Саюза

10 жніўня 1938 года

10 жніўня ў 2 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР у Крэмлі адбылося адкрыццё Другой Сесіі Совета Саюза.

Сесію адкрывае Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў А. А.**

Таварыш **Андрэеў А. А.** агалашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд Другой Сесіі Совета Саюза.

Дэпутат **Хрушчоў Н. С.** прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Совета Саюза пытанні ў парадак дня Другой Сесіі Совета Саюза.

Совет Саюза аднагалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Зацвярджэнне адзінага дзяржаўнага бюджэта Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год.
Уносіцца СНК СССР.
2. Праект «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».
Уносіцца СНК СССР.
3. Выбары Вярхоўнага суда СССР.
4. Праект закона «Аб грамадзянстве СССР».
Уносіцца СНК СССР.
5. Праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіацыі міжнародных дагавораў».
Уносіцца Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей.
6. Праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».
Уносіцца Камісіяй Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза.
7. Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.
Уносіцца ад групы дэпутатаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
8. Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, якія прыняты ў перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і належаць зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата **Сідарава І. І.** Совет Саюза прымае пастанову — Даклад урада аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. Заслухоўванне садакладаў бюджэтных камісій палат і абмеркаванне бюджэта весці раздзельна па палатах—у Совеце Саюза і ў Совеце Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Саюза закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей

10 жніўня 1938 года

10 жніўня ў 4 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР у Крэмлі адбылося адкрыццё Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Сесію адкрывае Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік Н. М.**

Таварыш **Швернік Н. М.** агалашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Дэпутат **Ібрагімаў Р. К.** прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Совета Нацыянальнасцей пытанні ў парадак дня Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Зацверджанне адзінага дзяржаўнага бюджэта Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год.
Уносіцца СНК СССР.
2) Праект «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».
Уносіцца СНК СССР.
3. Выбары Вярхоўнага суда СССР.
4. Праект закона «Аб грамадзянстве СССР».
Уносіцца СНК СССР.
5. Праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіацыі міжнародных дагавораў».
Уносіцца Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей.
6. Праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».
Уносіцца Камісіяй Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза.
7. Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.
Уносіцца ад групы дэпутатаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
8. Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата **Хахлова І. С.** Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову—Даклад урада аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей і Совета Саюза. Заслухоўванне садакладаў бюджэтных камісій палат і абмеркаванне бюджэта весці раздзельна па палатах—у Совеце Саюза і ў Совеце Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

(Працяг матэрыялаў Сесіі на 2 стар.)

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ НОВАГА ІЗАБРАЖЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА ГЕРБА БССР

У адпаведнасці з унясеннем Першай Сесіяй Вярхоўнага Совета БССР змен у артыкул 119 Канстытуцыі БССР зацвердзіць наступнае ізабражэнне дзяржаўнага герба Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. ПАПКОЎ.

г. Менск. 29 ліпеня 1938 г.

АПІСАННЕ ГЕРБА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Дзяржаўны Герб Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі складаецца з ізабражэння ў праменнях усходзячага сонца сярпа і молата, абкружаных вянком, які складаецца злева з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынай, і справа — з жытніх каласоў, пераплеценых ільном; унізе паміж абодвума палавінамі вянка знаходзіцца частка зямного шара. Абедзве палавіны вянка перавіты чырвонай лентай, на якой змешчаны надпісы на беларускай і рускай мовах: «Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!» і ніжэй ініцыялы «БССР». Уверсе герба знаходзіцца пяціканцовая зорка.

ДА ПАДЗЕЙ У РАЁНЕ ВОЗЕРА ХАСАН

Пры першай сустрэчы ваенных прадстаўнікоў СССР і Японіі 11 жніўня г.г. ваеннымі прадстаўнікамі СССР было заяўлена, што не гледзячы на спыненне ў 13 гадзін 30 мінут 11 жніўня (мясцовага часу) баявых дзеянняў, частка японскіх войск парушыла пагадненне аб перамір'і і, скарыстаўшы перамір'е прасунулася наперад на 100 метраў і заняла частку паўночнага ската вышыні Заазернай (Чанкуфын). Не гледзячы на пратэст ваенных прадстаўнікоў СССР і патрабаванне іх аб неадкладным адводзе японскіх войск на іх ранейшыя пазіцыі, японскія ваенныя прадстаўнікі катэгарычна адмовіліся выканаць гэта законнае патрабаванне. У сувязі з тым, што на ўказаным участку войскі абодвух старон зблізіліся да 4—5 метраў, і ўзброенная сутычка магла стыхійна зноў узнікнуць у любы момант, ваенныя прадстаўнікі абодвух бакоў на месцы вырашылі абаюдна адвесці на гэтым участку на 80 метраў назад войскі кожнай стараны. Па атрыманні аб гэтым данясенні совецкае камандаванне на Далёкім Усходзе ў адпаведнасці з заключаным пагадненнем аб перамір'і аддала распараджэнне аб неадкладным звароце нашых часцей на займаўшыяся імі ранейшыя пазіцыі, якія яны займалі ў 24 гадзіны 10 жніўня з указаннем патрабаваць ад японскіх прадстаўнікоў адводу японскіх войск. Гэта распараджэнне было выканана нашым камандаваннем неадкладна.

Адначасова Народны Камісар па замежных справах тав. Літвінаў указаў паслу Японіі п. Сігеміцу на гэта парушэнне перамір'я японскімі войскамі, патрабаваўшы адводу іх на гэтым участку не менш, чым на 100 метраў, папярэдзіўшы, што калі гэта не будзе выканана, то ўрад СССР будзе лічыць перамір'е парушаным па віне Японіі.

К данаму моманту японскія войскі адведзены ад вышэйуказанага пункта.

12 і 13 жніўня адбыліся зноў сустрэчы ваенных прадстаўнікоў СССР і Японіі, удакладніўшых размяшчэнне войск абодвух старон.

Аднак, на прапанову ваенных прадстаўнікоў СССР 13 жніўня падпісаць пратакол і карту, фіксіруючыя размяшчэнне войск абодвух старон, японскія ваенныя прадстаўнікі адмовіліся гэта зрабіць, заявіўшы, што яны чакаюць указанняў ад свайго вышэйшага начальства і, што, напэўна, прыбудзе для гэтага другая, больш аўтарытэтная камісія.

На гэтым ваенныя прадстаўнікі абодвух старон рассталіся.

14 жніўня новых сустрэч не было.

У раёне канфлікта зараз спакойна.

13 жніўня па прапанове японскіх ваенных прадстаўнікоў і са згоды ваенных прадстаўнікоў СССР адбыўся ўзаемны абмен трупамі.

Па падліку камандавання, забітых на совецкай старане аказалася 236 чалавек і раненых 611 чалавек.

Па ацэнцы нашага камандавання страты японскіх войск дасягаюць забітымі да 600 чалавек і раненымі да 2.500 чалавек.

(БЕЛТА).

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей

10 жніўня 1938 года

10 жніўня ў 7 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося першае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў** А. А.

З дакладам па пункту першаму парадку дня Сесіі — Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 г. выступіў Народны Камісар Фінансаў СССР тав. **Зверэў** А. Г.

Па сканчэнні даклада тав. **Зверэва** старшынствуючы тав. **Андрэеў А. А.** абвяшчае першае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей закрытым.

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

10 жніўня 1938 года

10 жніўня ў Крэмлі адкрылася Другая Сесія Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Як і сем месяцаў назад, у гістарычныя дні работ Першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, зноў ажыў Вялікі крэмлёўскі палац. У яго з'ехаліся з усіх канцоў Саюза народныя выбраннікі, узбагачаныя вопытам дзяржаўнай работы. Сюды, у сталіцу СССР, яны прывезлі весткі аб новых выдатных поспехах соцыялізма, якія атрымала краіна пасля Першай Сесіі Вярхоўнага Совета.

З большэвіцкай дзелавітасцю і арганізаванасцю Сесія прыступіла да разгляду важнейшых дзяржаўных пытанняў.

Днём 10 жніўня адбыліся пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей, якія праходзілі раздзельна. На іх быў зацверджан парадак дня і прынята рашэнне — Заслухаць даклад па першаму пытанню—Аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза ССР на 1938 год—на сумесным пасяджэнні абодвух палат вечарам 10 жніўня.

К 7 гадзінам вечара зала пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР перапоўнена дэпутатамі.

Прысутнічае многа гасцей—рабочыя маскоўскіх заводаў і фабрык, прадстаўнікі навукі, культуры, мастацтва, Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота.

У дыпламатычных ложах — прадстаўнікі дыпкорпуса. Шырока прадстаўлена совецкая і замежная прэса.

Ва ўрадавых ложах з'яўляюцца таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч, Варашылаў, Мікаян, Жданаў, Ежоў, Хрушчоў, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

З выключным натхненнем і ўздымам вітаюць дэпутаты і госці таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада. Па велізарнай зале няспынна пракатваецца гром воплескаў. З канца ў канец несуцца громкія, радасныя прывітанні на мовах народаў Совецкага Саюза: «Ура — Сталіну!», «Няхай жыве наш правадыр і настаўнік таварыш Сталін!»

Калі апладысменты сціхаюць, старшынствуючы — Старшыня Совета Саюза дэпутат Андрэеў А. А. абвяшчае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей адкрытым.

Слова для даклада Аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза ССР на 1938 год атрымлівае Народны Камісар Фінансаў СССР тав. Зверэў А. Г.

З вялікай увагай Сесія выслухоўвае даклад тав. Зверэва, насычаны яркімі цыфрамі і фактамі росквіту гаспадаркі і культуры Совецкага Саюза.

Таварыш Зверэў падрабязна характарызуе бюджэт Совецкага Саюза на 1938 год і ў заключэнне асобна спыняецца на патрэбах абароны краіны. Ен напамінае аб бясконцых правакацыйных проісках фашысцкіх краін, прабуючых раздуць вайну супроць СССР. Задача заключаецца ў тым, каб нястомна мацаваць абаронную магутнасць вялікай краіны соцыялізма. У адпаведнасці з гэтым дзяржаўны бюджэт Саюза на 1938 год прадугледжвае асігнаванні на патрэбы абароны краіны ў размеры 27 мільярдаў рублёў.

Сесія Вярхоўнага Совета СССР, выражаючы сваё адабрэнне, бурнымі апладысментамі вітае заяву Народнага Камісара Фінансаў. Дэпутаты наладжваюць гарачую авацыю ў гонар непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Пасля даклада тав. Зверэва пасяджэнне закрываецца. (БЕЛТА).

———О———

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Совета Саюза

11 жніўня 1938 года

11 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося другое пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе — Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў** А. А.

Совет Саюза заслухоўвае садаклад Старшыні Бюджэтнай камісіі Совета Саюза дэпутата **Сідарава** І. І. па пункту першаму парадка дня—Аб зацверджанні адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

Пасля садаклада Бюджэтнай камісіі Совет Саюза пераходзіць да спрэчак па дакладу аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 г.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Каротчанка** Д. С. (Амур-Ніжне-Днепроўская акруга, Днепрапетроўская вобласць, УССР), **Кулієў** Т. І. (Сабір-Абадская акруга, Азербайджанская ССР), **Пічугіна** П. Н. (Пролетарская акруга, г. Масква), **Шагімарданаў** Ф. В. (Дуванская акруга, Башкірская АССР), Народны камісар фінансаў РСФСР тав. **Папоў** В. Ф. і дэпутат **Курбанаў** М. (Кулябская акруга, Таджыкская ССР).

На гэтым другое пасяджэнне Другой Сесіі Совета Саюза закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей

11 жніўня 1938 года

11 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося другое пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае садаклад Старшыні Бюджэтнай камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутата **Хахлова І. С.** па пункту першаму парадка дня — Аб зацверджанні адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

Пасля садаклада Бюджэтнай камісіі Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да спрэчак па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 г.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Булганін** Н. А. (Маскоўская гарадская акруга, РСФСР), **Хоштарыя** С. Г. (Гагрынская акруга, Абхазская АССР), **Кулагін** М. В. (Слуцкая гарадская акруга, БССР), **Арушанян** Ш. М. (Мікаянаўская акруга, Армянская ССР) і **Дынмухаметаў** Г. А. (Нова-Шэшмінская акруга, Татарская АССР).

На гэтым другое пасяджэнне Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

11 жніўня 1938 г.

У Совеце Саюза

На другім пасяджэнні Совета Саюза раніцай 11 жніўня пачалося абмеркаванне адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў** А. А., адкрываючы пасяджэнне, прадастаўляе слова для садаклада Бюджэтнай камісіі дэпутату **Сідараву** І. І.

Тав. Сідараў падрабязна паведамляе, якую работу прарабіла Бюджэтная камісія пры разглядзе бюджэта. Пад шумныя апладысменты дэпутатаў і гасцей ён перш за ўсё адзначае, што прадстаўлены ўрадам праект дзяржаўнага бюджэта на 1938 год поўнасцю адпавядае палітыцы і рашэнням большэвіцкай партыі і совецкай улады аб неабходнасці мабілізаваць максімум сродкаў на справу ўмацавання індустрыялізацыі краіны, павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных, умацавання абараназдольнасці совецкай дзяржавы.

Тав. Сідараў спыняецца на даходнай частцы бюджэта, узрастаючай больш чым на 20 мільярдаў рублёў па параўнанню з мінулым годам.

Пераходзячы да расходнай часткі бюджэта, тав. Сідараў гаворыць, што ўрад улічыў усе неабходныя дзяржаўныя патрэбы і правільна вызначыў напрамак расходвання сродкаў. Самы вялікі артыкул расходаў па бюджэту — гэта затраты на народную гаспадарку. У бягучым годзе на гэтыя мэты асігнуецца 47.212 мільёнаў рублёў — на 20 процантаў больш у параўнанні з мінулым годам.

Другі буйны артыкул расходаў—затраты на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. Па гэтаму раздзелу намечана зрасходваць 31 мільярд рублёў. Калі сюды дадаць сродкі, адпускаемыя на культурныя мэты профсаюзамі, кааператыўнымі і грамадскімі арганізацыямі, то агульная сума затрат на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы перавысіць у бягучым годзе 42 мільярды рублёў.

З улікам усіх гэтых дапаўненняў і змен дзяржаўны бюджэт Саюза на 1938 год складзе ў расходнай частцы 125.278.993 тысячы рублёў і ў даходнай—126.778.993 тысячы рублёў.

Адкрываюцца спрэчкі па дакладу аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год. Першым выступае старшыня Совета Народных Камісараў Украінскай ССР дэпутат **Каротчанка** Д. С.

Ен гаворыць аб магутнасці вялікай соцыялістычнай дзяржавы, аб выдатных рысах бюджэта СССР, які адлюстроўвае інтарэсы совецкага народа.

Тав. Каротчанка прыводзіць шматлікія факты, якія ілюструюць велізарныя поспехі Совецкай Украіны, рост яе індустрыі, культуры, бюджэта, гарадоў і сельскай гаспадаркі. Бюджэт Совецкай Украіны дасягае ў 1938 годзе 6 мільярдаў рублёў. Дэпутат Каротчанка адабрае абмяркоўваемы бюджэт СССР на 1938 год і заяўляе, што калі спатрэбіцца, то мы ўтроім і ўдзесяцерым асігнаванні на справу абароны краіны.

Слова бярэ дэпутат **Кулієў** Т. І. — старшыня Соўнаркома Азербайджанскай ССР. Тав. Кулієў адзначае, што бюджэт Саюза складзен з разлікам на ўсямернае задаволенне растучых з кожным днём соцыяльна-культурных і гаспадарчых запатрабаванняў народаў СССР. Яркае таму сведчанне—бюджэт Азербайджанскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Бюджэт Азербайджана на 1938 год у параўнанні з 1933 годам узрос на 410 процантаў і складае 916 мільёнаў рублёў.

На трыбуне—дэпутат **Пічугіна** П. Н., старшыня Таганскага райсовета (Масква). Падтрымліваючы прапанову выступаўшых дэпутатаў аб зацверджанні бюджэта на 1938 г., яна адзначае, што ў некаторых нашых установах і арганізацыях няма сапраўдных гаспадарчых адносін да дзяржаўных грошай. У якасці прыклада яна называе Наркаммаш, некаторыя главкі якога прадаўжаюць яшчэ жыць на дзяржаўныя датацыі. Да іх адносяцца Галоўцяжмаш, Галоўтрансмаш.

Дэпутат **Шагімарданаў** Ф. В.—старшыня Совета Народных Камісараў Башкірскай АССР — у сваім выступленні падкрэслівае, што бюджэтам прадугледжан далейшы рост эканомікі і культуры Саюзных і Аўтаномных рэспублік. Дэпутат Шагімарданаў расказвае аб бурным эканамічным і культурным росце Башкірскай рэспублікі.

Тав. **Папоў** В. Ф. — нарком фінансаў РСФСР — у сваім выступленні адзначае, што ў адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза знайшлі правільнае адлюстраванне інтарэсы Расійскай Федэрацыі. Ен прыводзіць яркія лічбы выключнага росту бюджэта РСФСР. Бюджэт усёй царскай Расіі ў 1913 г. складаў 2,5 мільярда рублёў. Бюджэт толькі Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі на 1938 год складае 21,5 мільярда рублёў. Таржаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, клопаты большэвіцкай партыі і ўрада аб працоўных ярка выражаны ў бюджэтах Аўтаномных рэспублік РСФСР. У параўнанні з першым годам другой сталінскай пяцігодкі аб'ём бюджэтаў Аўтаномных рэспублік РСФСР у 1938 годзе вырас у тры разы, а па асобных Аўтаномных рэспубліках назіраецца яшчэ большы рост. Так, напрыклад, бюджэт Якуціі вырас у 3,5 раза, Башкірыі—у 4 разы, Кабардына-Балкарыі—у 5 разоў.

Дэпутат **Курбанаў** М. — старшыня Соўнаркома Таджыкскай ССР—з глыбокім задаволеннем адзначае, што ў бюджэце ўдзелена дастатковая ўвага абароне краіны.

— Мы абмяркоўваем пытанне аб дзяржаўным бюджэце ў надзвычай адказны момант. Ва ўсёй нашай краіне бушуе хваля абурэння супроць нахлых спроб японскай ваеншчыны ўпягнуць Совецкі Саюз у вайну. Японская ваенная кліка пралічылася, самураі атрымалі ўнушальны ўрок ад нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, зорка аберагаючай непарушнасць граніц нашай вялікай радзімы.

Дэпутат Курбанаў робіць заўвагі аб рабоце Наркамфіна і яго органаў на месцах.

Пасля выступлення дэпутата Курбанава пасяджэнне закрываецца.

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Вечарам 11 жніўня ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР адбылося другое пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей, на якім пачалося абмеркаванне адзінага дзяржаўнага бюджэта Саюза ССР на 1938 год.

Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. прадастаўляе слова для садаклада Бюджэтнай камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутату **Хахлову** І. С.

— Дзяржаўны бюджэт Саюза ССР,— гаворыць тав. Хахлоў, — з'яўляецца важнейшай часткай народна-гаспадарчага плана і адлюстроўвае далейшы рост гаспадаркі соцыялістычнай радзімы.

Тав. Хахлоў прыводзіць лічбы асігнаванняў на фінансаванне народнай гаспадаркі, асобных наркаматаў.

Значна ўзрастаюць асігнаванні на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. Так, расходы на асвету складаюць звыш 20 мільярдаў рублёў. А царскі ўрад у 1913 годзе расходваў на справу народнай асветы толькі 182 мільёны рублёў. Усё гэта паказвае, як нязмерна вырасла культура народаў нашай краіны.

Рост бюджэта бачны на прыкладзе кожнай Саюзнай рэспублікі. Напрыклад, бюджэт Расійскай рэспублікі разам з Казахстанам і Кіргізіяй у 1933 г. раўняўся 5.7 мільярда рублёў, а ў гэтым годзе — 23 мільярды рублёў. Бюджэт Грузінскай, Азербайджанскай і Армянскай Саюзных рэспублік з 689 мільёнаў рублёў павялічыўся за гэты час да 2.367 мільёнаў рублёў. Такая-ж карціна па Украінскай, Беларускай і іншых рэспубліках.

Тав. Хахлоў далей дакладвае аб зменах, унасімых у праект дзяржаўнага бюджэта. Бюджэтная камісія лічыць магчымым павялічыць даходную частку на суму звыш паўтара мільярда рублёў. Камісія просіць зацвердзіць бюджэт па даходах у суме 126.777.693 тысячы рублёў, а па расходах у суме 125.277.693 тысячы рублёў, з перавышэннем даходаў над расходамі ў паўтара мільярда рублёў.

— Дзяржаўны бюджэт СССР 1938 г.— гаворыць у заключэнне тав. Хахлоў,— з'яўляецца нагляднай дэманстрацыяй найвялікшых перамог соцыялізма, атрыманых народамі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра народаў таварыша Сталіна. **(Бурныя, працяжныя апладысменты).**

У спрэчках па садакладу першым выступае дэпутат **Булганін** Н. А. — — Старшыня Совета Народных Камісараў РСФСР.

У сваёй прамове тав. Булганін гаворыць аб адзіным бюджэце СССР, які поўнасцю забяспечвае фінансаванне мерапрыемстваў, намечаных народнагаспадарчым планам на 1938 год. Значыць, — гаворыць тав. Булганін, — бюджэт поўнасцю і цалкам адказвае інтарэсам нашай дзяржавы, інтарэсам нашага народа.

Разам з ростам бюджэта Совецкага Саюза з кожным годам растуць і бюджэты Саюзных рэспублік. Бюджэт Расійскай Федэрацыі ў бягучым годзе складае 21.400 мільёнаў рублёў — на 13.5 процанта больш мінулагодняга.

У заключэнне тав. Булганін гаворыць аб апошніх падзеях на Далёкім Усходзе, дзе японская ваеншчына зрабіла рад правакацыйных нападаў на совецкую тэрыторыю. Сесія не можа прайсці міма гэтых фактаў. Пад бурныя, працяжныя апладысменты ўсіх прысутнічаючых тав. Булганін заяўляе, што ўвесь совецкі народ горача вітае цвёрдую і рашучую палітыку совецкага ўрада ў адносінах да зарваўшайся японскай ваеншчыны. Працоўныя патрабуюць і надалей даваць рашучы адпор усякім правакацыйным дзеянням японскай ваеншчыны.

Апладысменты ўспыхваюць з новай сілай, калі тав. Булганін гаворыць аб неабходнасці далейшага ўмацавання магутнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Паветранага і Ваенна-Марскога Флота.

Усе выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты аднадушна заяўлялі, што праект бюджэта поўнасцю адлюстроўвае вялікія прынцыпы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, забяспечвае далейшы рост усіх галін гаспадаркі і культуры ў Саюзных і Аўтаномных рэспубліках.

Аб велізарным росце народнай гаспадаркі Беларусі расказвае дэпутат **Кулагін М. В.** Бюджэт Беларускай ССР устаноўлен у суме 1.167 мільёнаў рублёў. Найярчэйшым сведчаннем сталінскіх клопатаў аб чалавеку з'яўляецца асігнаванне 830 мільёнаў рублёў на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы — на 21,2 проц. больш, чым у мінулым годзе.

Дэпутат **Арушанян** Ш. М., адабраючы праект бюджэта, спыняецца на радзе пытанняў, якія не знайшлі адлюстравання ў абмяркоўваемым бюджэце. Ен лічыць, што неабходна прадугледзець у бюджэце будучага года будаўніцтва ГЭС на Севане, арганізацыю вытворчасці аўтамашын і штучнага шоўку, скарыстоўваючы адыходы карбіднай прамысловасці.

— Неаправяргальным доказам матэрыяльнага добрабыту працоўных Татарыі з'яўляецца рост бюджэта рэспублікі, — гаворыць дэпутат **Дынмухаметаў** Г. А. У параўнанні з 1923 годам бюджэт Татарскай АССР павялічыўся ў гэтым годзе больш, чым у 60 разоў. Ен складае 364.2 мільёна рублёў. З гэтай сумы на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы расходуецца 273,2 мільёна рублёў, г. зн. 72 проц.

Пасля выступлення дэпутата Дынмухаметава пасяджэнне закрываецца.

(БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА

13 жніўня 1938 года

13 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося трэцяе пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Наталевіч** Н. Я. (Слуцкая акруга, Беларуская ССР), **Бакрадзе** В. М. (Кутаіская акруга, Грузінская ССР), **Ніканораў** А. Ф. (Архангельская гарадская акруга, Архангельская вобласць), **Шарафееў** С. М. (Мензелінская акруга, Татарская АССР), **Пірузян** А. С. (Кіравакanская акруга, Армянская ССР), **Іваноў** С. М. (Улан-Удэнская сельская акруга, Бурат-Мангольская АССР) і **Нікалаева** К. І. (Кашынская акруга, Калінінская вобласць).

На гэтым трэцяе пасяджэнне Другой Сесіі Совета Саюза закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

13 жніўня 1938 года

13 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося трэцяе пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе—Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Бурмісцэнка** М. А. (Майкопская сельская акруга, Адыгейская аўтаномная вобласць), **Алієў** А. М. (Джульфінская акруга, Нахічэванская АССР), **Смагіна** А. Г. (Сталінабадская гарадская акруга, Таджыкская ССР), **Ібраімаў** М. І. (Бахчысарайская акруга, Крымская АССР), **Юлдашэў** М. (Ташкенцкая-Кіраўская акруга, Узбекская ССР), **Ібрагімаў** Р. К. (Мелеузоўская акруга, Башкірская АССР), **Тахтараў** А. Г. (Махач-Калінская гарадская акруга, Дагестанская АССР) і **Атлієў** С. (Чарджоўская сельская акруга, Туркменская ССР).

На гэтым трэцяе пасяджэнне Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

13 жніўня 1938 года

У Совеце Саюза

У 11 гадзін раніцы, 13 жніўня, адкрылася трэцяе пасяджэнне Совета Саюза. У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета, Народныя Камісары.

Прадаўжаюцца спрэчкі па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

Старшынствуючы — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д. прадастаўляе слова дэпутату **Наталевічу Н. Я.**

Яркімі фактамі і лічбамі малюе дэпутат Наталевіч росквіт гаспадаркі і культуры Беларускай ССР.

— Кожная лічба бюджэта Саюза ССР сведчыць аб велізарных клопатах ленінска-сталінскай партыі і совецкага ўрада аб працоўных,—гаворыць дэпутат **Бакрадзе** В. М.

Тав. Бакрадзе гаворыць аб выключным уздыме нацыянальных рэспублік у выніку правільнага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дапамогі ўрада Саюза ССР і штодзённых клопатаў таварышаў Сталіна і Молатава.

Дэпутат **Ніканораў** А. Ф. напамінае, што ў годы руска-японскай вайны царскі ўрад адпускаў на патрэбы народнай асветы толькі 36 мільёнаў рублёў. У бюджэце краіны перамогшага соцыялізма на справу народнай асветы ў бягучым годзе намечана больш 20 мільярдаў рублёў — 17 проц. бюджэта. Такой магутнай стала наша краіна. Яна здольна даць адпор любому агрэсару.

Тав. Ніканораў крытыкуе Наркамфін за нездавальняючую работу па развіццю ашчаднай справы.

Дэпутат **Шарафееў** С. М. крытыкуе Наркамфін за непаваротлівасць у вырашэнні раду пытанняў. На працягу 7 месяцаў Наркамфін не можа вырашыць, напрыклад, пытання аб фінансаванні мясцовай прамысловасці Татарыі. Да гэтага часу Наркамфінам таксама не прыняты меры да спрашчэння работы па спагнанню падатку з абарота. Існуючая сістэма складаная і заблытаная.

Дэпутат **Пірузян** А. С. сваё выступленне прысвячае дасягненням Армянскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, ператварыўшайся за годы сталінскіх пяцігодак у краіну перадавой культуры. Значна вырас дзяржаўны бюджэт Арменіі. У пачатку першай пяцігодкі ён складаў 23 млн. рублёў, а ў гэтым годзе — 388 млн. рублёў. Выраслі новыя галіны прамысловасці — хімічная, цэментная, тэкстыльная, табачная, скураная і іншыя.

Бюджэт Совецкага Саюза на 1938 год — большэвіцкі ўдар па японскіх агрэсарах, якія арганізоўваюць правакацыі супроць СССР. Армянскі народ разам з усімі народамі СССР па першаму заклiку партыі і ўрада і правадыра народаў таварыша Сталіна будзе грудзьмі абараняць шчаслівую соцыялістычную радзіму.

На трыбуне — дэпутат **Іваноў** С. М. Падтрымліваючы прапановы выступаўшых да яго дэпутатаў аб зацвярджэнні бюджэта СССР на 1938 год, тав. Іваноў асабліва падкрэслівае клопаты партыі і ўрада аб уздыме гаспадаркі і культуры раней адсталых народаў. Яркім прыкладам таму з'яўляецца Бурат-Мангольская АССР. За годы сталінскіх пяцігодак велізарныя асігнаванні былі накіраваны на ўздым яе эканомікі і культуры. Тут створаны прадпрыемствы саюзнага значэння — паравоза-вагонарамонтны завод, мясакамбінат, механізаваны шклозавод і інш. У Бурат-Манголіі няма больш качавых і поўкачавых гаспадарак. У калгасах знаходзіцца 91 проц. гаспадарак. За час з 1923 года пасеўная плошча павялічылася амаль у тры разы.

У велізарнай ступені павялічыліся асігнаванні на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. Характэрны такі прыклад: у 1913 годзе царскі ўрад расходваў на асвету 70 капеек на душу насельніцтва. У 1937 годзе ў Бурат-Мангольскай АССР расходвалася на народную асвету 74 руб. 63 кап. на чалавека. Гэта найярчэйшы паказальнік клопатаў партыі і ўрада аб культурным развіцці народа, паказальнік таржаства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Тав. Іваноў адзначае рад упушчэнняў у рабоце народных камісарыятаў фінансаў СССР і РСФСР пры складанні бюджэта.

Апошняй на ранішнім пасяджэнні Совета Саюза 13 жніўня выступае дэпутат тав. **Нікалаева** К. І.

— Кожны з нас, — гаворыць яна, — з найвялікшай радасцю ўспрыняў лічбы бюджэта Совецкага Саюза. Кожная лічба з усёй яркасцю і пераканаўчасцю гаворыць аб велізарным росце народнага дахода і багацця нашай краіны, аб росце заможнага і культурнага жыцця многамільённага народа СССР.

Расходы на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы ў 1933 годзе складалі 6 млрд. руб., а ў гэтым годзе на гэтыя патрэбы намечана 31.386 млн. рублёў. Разам з затратамі з пазабюджэтных крыніц гэтыя расходы будуць складаць звыш 42 мільярдаў рублёў. Няма больш такой краіны ў свеце, дзе столькі сродкаў трацілася-б на гэтыя мэты.

Тав. Нікалаева гаворыць далей аб росце расходаў на ахову здароўя, аб вялікай дапамозе мацеры і дзіцяці ў совецкай краіне.

У заключэнне тав. Нікалаева гаворыць аб проісках фашысцкіх агрэсараў, якія прабуюць раздуць пажар новай сусветнай вайны.

— Наш совецкі народ, — заяўляе пад шумныя рукапляскані тав. Нікалаева, — цвёрда верыць у сваю перамогу і не паздаровіцца таму, хто папрабуе занесці сваю руку на заваёвы соцыялізма.

Выступленнем тав. Нікалаевай заканчваецца пасяджэнне Совета Саюза.

У Совеце Нацыянальнасцей

13 жніўня, вечарам, на трэцім пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей прадаўжаліся спрэчкі па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год. У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета, народныя камісары.

Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. прадастаўляе слова дэпутату **Бурмістэнка** М. А.

Тав. Бурмістэнка гаворыць аб велізарных поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў Совецкай Украіне.

Совецкая Украіна — рэспубліка суцэльнай пісьменнасці. У той-жа час у Заходняй Украіне, якая знаходзіцца пад гнётам фашысцкай Польшчы, нават па афіцыяльных даных польскай статыстыкі 60 проц. украінцаў — непісьменныя, пры чым процант гэты з года ў год павялічваецца.

Заканчваючы сваю прамову, тав. Бурмістэнка гаворыць:

— Учора з апублікаванага ў друку паведамлення мы даведаліся аб спыненні ваенных дзеянняў у раёне возера Хасан.

Гэта — вынік цвёрдасці і непахіснасці совецкага ўрада. Гэта — рэзультат гатоўнасці нашага народа абараняць справу міру і сакрушыць падпальшчыкаў вайны, калі яны папрабуюць уторгнуцца на совецкую зямлю.

Наш народ гаворыць японскім самураям і ўсім падпальшчыкам вайны: мы вайны не хочам, але мы нас папярэджваем, што да вайны гатовы. Увесь совецкі народ, кіруемы геніяльным правадыром працоўных вялікім Сталіным, усёй магутнасцю нашай вялікай соцыялістычнай дзяржавы маланкава абрушыцца на любога ворага, калі ён нападзе на краіну соцыялізма, знішчыць ворага поўнасцю, да канца і без астатку.

Дэпутат **Алієў** А. М. характарызуе рост народнай гаспадаркі Азербайджана. Бюджэт Азербайджанскай ССР за апошнія пяць год вырас да 915 млн. рублёў — больш чым на 400 процантаў. Асабліва вялікія асігнаванні на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы — 636 млн. рублёў, гэта значыць амаль на 600 процантаў больш, чым у 1933 годзе. Гаворачы аб поспехах сельскай гаспадаркі рэспублікі, тав. Алієў паведамляе, што ў Азербайджане налічваецца 150 калгасаў-міліянераў.

Працяглымі апладысментамі сустракаюць дэпутаты і госці словы дэпутата **Смагінай** А. Г. — лётчыцы грамадзянскага паветранага флота — аб тым, што японскія самураі, правакуючы Совецкі Саюз на вайну, пралічыліся. Апладысменты ператвараюцца ў бурную авацыю, калі тав. Смагіна гаворыць аб магутнасці доблеснай Чырвонай Арміі, кіруемай жалезным наркомам, Першым маршалам Совецкага Саюза К. Е. Варашылавым.

Дэпутат працоўных Таджыкістана т. Смагіна расказвае, як за годы двух сталінскіх пяцігодак змяніўся твар Таджыкскай ССР.

Дэпутат **Ібраімаў** М. І. гаворыць, што асігнаванні па бюджэту 1938 года забяспечаць яшчэ большы росквіт Крымскай АССР. Ен расказвае як некалі адсталы землярobчы Крым пад кіраўніцтвам большэвікоў ператварыўся ў рэспубліку з буйнай прамысловасцю.

Пасля перапынку выступае з прамовай дэпутат **Юлдашэў** М. Ен прыводзіць лічбы бюджэта Узбекскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, ілюструючыя росквіт яе гаспадаркі і культуры.

(Працяг на 3-й стар.).

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

У Совеце Нацыянальнасцей

(ПРАЦЯГ)

— Адзіны дзяржаўны бюджэт, — заканчвае сваю прамову таварыш Юлдашэў, — з'яўляецца матэрыяльным выражэннем дружбы ўсіх народаў нашай краіны. Гэта дружба і незвычайная згуртаванасць вялікага совецкага народа вакол партыі Леніна—Сталіна забяспечваюць Совецкаму Саюзу такую магутнасць, такую сілу, якая дазваляе нам смела і ўпэўнена ісці наперад пад кіраўніцтвам нашага настаўніка і правадыра—таварыша Сталіна на заваёвы вышынь комунізма. **(Бурныя апладысменты, авацыя, прывітальныя воклічы на нацыянальных мовах у гонар таварыша Сталіна).**

Выступае дэпутат **Ібрагімаў** Р. К.

Расказаўшы аб поспехах Башкірскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, тав. Ібраімаў асоба закранае рад гаспадарчых пытанняў, у прыватнасці, пытанне аб упарадкаванні раённых цэнтраў.

Наступны аратар — дэпутат **Тахтараў** А. Г. адабрае бюджэт Саюза на 1938 год і прапануе яго зацвердзіць. Ён гаворыць аб дасягненнях Дагестанскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. У краіне гор расце прамысловасць. У 1937 годзе валавая прадукцыя яе склала 114 мільёнаў рублёў. За першыя шэсць месяцаў гэтага года прырост прадукцыі складае 27,5 процанта.

Мацнее калгасная гаспадарка рэспублікі. У калгасах аб'яднана каля 90 проц. гаспадарак.

Апошнім на пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей 13 жніўня выступае дэпутат **Атлієў** С. Прапануючы зацвердзіць бюджэт СССР на 1938 год, ён падкрэслівае, што поўнае і своечасовае фінансаванне ўсіх мерапрыемстваў патрабуе ўзмоцненай барацьбы за выкананне намечаных бюджэтам даходаў, за вышуканне новых крыніц дахода.

Пасля выступлення тав. Атліева пасяджэнне закрываецца. (БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА 14 жніўня 1938 года

14 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося чацвертае пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Верэндзякін** В. В., (Лукаянаўская акруга, Горкаўская вобласць), **Нікіцін** А. Н. (Баровіцкая акруга, Ленінградская вобласць), **Волкаў** М. А. (Балашоўская акруга, Саратаўская вобласць) і старшыня Камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР тав. **Кафтанаў** С. В.

Па сканчэнні спрэчак Совет Саюза заслухоўвае заключныя словы дакладчыка — народнага камісара фінансаў СССР тав. **Зверэва** А. Г. і садакладчыка — Старшыню Бюджэтнай Камісіі Совета Саюза дэпутата **Сідарава** І. І.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацвярджання адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 г. Совет Саюза прымае прапанову дэпутата Сідарава І. І. галасаваць бюджэт па раздзелах, а пры наяўнасці паправак унутры раздзелаў — па асобных артыкулах. Следам за гэтым праходзіць чытанне і зацверджанне бюджэта па раздзелах і артыкулах.

Ад імя групы дэпутатаў, працуючых у профсаюзах, дэпутат **Нікалаева** К. І. уносіць прапанову залічыць у адзіны дзяржаўны бюджэт СССР бюджэт соцыяльнага страхавання, паколькі сродкі, утвараемыя ў гэтым бюджэце, з'яўляюцца дзяржаўнымі сродкамі і па свайму назначэнню яны цалкам накіроўваюцца на тыя-ж мэты і задачы, якія вырашае дзяржаўны бюджэт у галіне матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных мас. Совет Саюза аднагалосна прымае гэту прапанову.

Совет Саюза ў парадку паартыкульнага чытання аднагалосна зацвярджае — па артыкулах, а затым і ў цэлым—«Закон аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год».

Па прапанове дэпутата **Залікіна** А. Т. Совет Саюза прымае пастанову — даклад аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым чацвертае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Саюза закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 14 жніўня 1938 года

14 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося чацвертае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

У спрэчках выступілі дэпутат **Красноў** Н. Д. (Цывільская акруга, Чувашская АССР), Старшыня Дзяржплана СССР тав. **Вазнесенскі** Н. А. і дэпутат **Казакпаеў** А. (Акмолінская акруга, Казахская ССР). Тав. Казакпаеў гаворыць сваю прамову на казахскай мове; прамова яго затым перакладзіцца на рускую мову.

Па сканчэнні спрэчак Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае заключныя словы дакладчыка — народнага камісара фінансаў СССР тав. **Зверэва** А. Г. і садакладчыка — Старшыні Бюджэтнай Камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутата **Хахлова** І. С.

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацверджання адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

Совет Нацыянальнасцей прымае прапанову дэпутата Хахлова І. С. галасаваць бюджэт па раздзелах, а пры наяўнасці паправак унутры раздзелаў — па асобных артыкулах. Следам за гэтым адбываецца чытанне і зацверджанне бюджэта па раздзелах і артыкулах.

Ад імя групы дэпутатаў, працуючых у профсаюзах, дэпутат **Маскатаў** П. Г. уносіць прапанову залічыць у адзіны дзяржаўны бюджэт СССР бюджэт соцыяльнага страхавання, паколькі сродкі, утвараемыя ў гэтым бюджэце, з'яўляюцца дзяржаўнымі сродкамі і па свайму назначэнню яны цалкам накіроўваюцца на тыя-ж мэты і задачы, якія вырашае дзяржаўны бюджэт у галіне матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных мас. Совет Нацыянальнасцей аднагалосна прымае гэту прапанову.

Совет Нацыянальнасцей у парадку паартыкульнага чытання аднагалосна зацвярджае — па артыкулах, а затым і ў цэлым — «Закон аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год».

Па прапанове дэпутата **Ворошнова** П. А. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — даклад аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым чацвертае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

14 жніўня 1938 г.

У Совеце Саюза

Раніцой, 14 жніўня, адкрываецца чацвертае пасяджэнне Совета Саюза.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада. Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Прадаўжаюцца спрэчкі па дакладу Аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год.

Старшынствуючы — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д. прадастаўляе слова дэпутату **Верэндзякіну** В. В. Тав. Верэндзякін гаворыць аб поспехах Мардоўскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі:

Дэпутат **Нікіцін** А. Н. спыняецца на гіганцкіх поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў Ленінградзе і Ленінградскай вобласці.

Дэпутат **Волкаў** М. А. адзначае поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў Саратаўскай вобласці, якія знайшлі сваё яркае адлюстраванне ў росце мясцовага бюджэта.

Выступіўшы ў спрэчках Старшыня Камітэта па справах Вышэйшай школы пры СНК СССР тав. **Кафтанаў** С. В. адзначыў, што ў СССР у вышэйшай школе навучаецца 550 тыс. чалавек — больш, чым ва ўсіх 23 капіталістычных краінах Еўропы разам узятых.

Па сканчэнні прамовы тав. Кафтанава спрэчкі па дакладу аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 г. спыняюцца.

З заключным словам выступае дакладчык — народны камісар фінансаў СССР тав. **Зверэў** А. Г.

Тав. Зверэў адзначае, што праект адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 г., прадстаўлены Советам Народных Камісараў СССР, сустрэў аднадушнае адабрэнне.

Тав. Зверэў асоба спыняецца на прапановах Бюджэтнай Камісіі Совета Саюза.

Гаворачы аб крытычных заўвагах па рабоце асобных гаспадарчых Наркаматаў — Наркамааға, Наркамзема, Наркаммаша, Наркамгандлю, не выконваючых раду сваіх фінансавых абавязацельстваў перад дзяржаўным бюджэтам, тав. Зверэў па даручэнню Совета Народных Камісараў заяўляе, што Соўнарком улічыць усе гэтыя крытычныя заўвагі і прыме неабходныя меры да паляпшэння работы Наркаматаў. Тав. Зверэў лічыць таксама безумоўна правільнымі крытычныя заўвагі аб рабоце Наркамфіна Саюза, выказаныя на Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Пасля тав. Зверэва з заключным словам выступае старшыня Бюджэтнай камісіі Совета Саюза дэпутат **Сідараў** І. І. Адзначаючы, што абмеркаванне адзінага дзяржаўнага бюджэта прайшло на высокім палітычным узроўні, тав. Сідараў гаворыць, што трэба па-большэвіцку забяспечыць выкананне гэтага бюджэта, які адлюстроўвае магутнасць краіны соцыялізма.

Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацверджання адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

Ад імя групы дэпутатаў, працуючых у профсаюзах, дэпутат **Нікалаева К. І.** уносіць прапанову залічыць у адзіны дзяржаўны бюджэт СССР бюджэт соцыяльнага страхавання, паколькі сродкі, утвараемыя ў гэтым бюджэце, з'яўляюцца дзяржаўнымі сродкамі і па свайму назначэнню яны цалкам накіроўваюцца на тыя-ж мэты і задачы, якія вырашае дзяржаўны бюджэт у галіне матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных мас. Совет Саюза аднагалосна прымае гэту прапанову.

Совет Саюза ў парадку паартыкульнага чытання аднагалосна зацвярджае — па артыкулах, а затым і цалкам — «Закон аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год».

Па прапанове дэпутата **Залікіна** А. Т. Совет Саюза прымае пастанову — даклад аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым чацвёртае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Саюза закрываецца.

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Вечарам 14 жніўня адбылося чацвёртае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей, на якім прадаўжалася абмеркаванне адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

Першым у спрэчках выступае дэпутат **Красноў** Н. Д.

Дэпутат Красноў адзначае, што на аснове росту фінансавання соцыялістычнага будаўніцтва Чувашскай рэспублікі валавая прадукцыя яе прамысловасці за 20 год вырасла ў 22 разы.

— Бюджэт соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, — гаворыць старшыня Дзяржплана СССР тав. **Вазнесенскі** Н. А., — з'яўляецца самым моцным бюджэтам у свеце.

Апошнім у спрэчках выступае дэпутат **Казакпаеў** А. з прамовай на казахскай мове. Ён адзначае, што за годы совецкай улады Казахстан ператварыўся ў квітнеючую індустрыяльна-аграрную соцыялістычную рэспубліку.

Пасля перапынку дакладчык — Народны Камісар Фінансаў СССР тав. Зверэў А. Г. — выступае з заключным словам.

— На пасяджэннях Совета Нацыянальнасцей і Совета Саюза, — гаворыць тав Зверэў, — дэпутаты ўсебакова абмеркавалі праект адзінага дзяржаўнага бюджэта, прадстаўленага Соўнаркомам СССР. Яны аднадушна адобрылі гэты праект. Пры абмеркаванні праекта Бюджэтнай камісіяй былі ўнесены папраўкі ў даходную і расходную часткі бюджэта.

Тав. Зверэў заяўляе таксама, што ён цалкам і поўнасцю падзяляе крытычныя заўвагі дэпутатаў і старшыні Бюджэтнай камісіі аб рабоце Народнага Камісарыята фінансаў СССР.

Далей з заключным словам выступае Старшыня Бюджэтнай Камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Хахлоў** І. С.

— Наш бюджэт, — гаворыць ён, — адлюстроўвае інтарэсы многанацыянальнага совецкага народа. Вось чым тлумачыцца аднадушнасць, з якой праходзіла абмеркаванне праекта адзінага дзяржаўнага бюджэта.

Адкрыццё Сесіі саўпала з нападам японскіх агрэсараў на граніцы нашага Далёкага Усхода. Трэба сказаць, што Сесія Вярхоўнага Совета засядае з большэвіцкім спакоем, з большэвіцкай упэўненасцю, з захаваннем свайго дастоінства. У той-жа час, па даручэнню нашага ўрада байцы доблеснага Далёкаўсходняга Чырвонасцяжнага Фронта разбілі нагалаву ўсіх тых, хто прабаваў напасці на граніцы нашага свяшчэннага Совецкага Саюза.

Наша Сесія прадэманстравала перад усім светам маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, яго агуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол правадыра народаў таварыша Сталіна.

Дэпутаты і госці сустракаюць гэтыя словы тав. Хахлова бурнай, доўга не змаўкаючай авацыяй. Адусюль нясуцца воклічы: «Няхай жыве вялікі Сталін!» «Таварышу Сталіну — ура!»

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацверджання адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год.

Ад імя групы дэпутатаў, працуючых у профсаюзах, дэпутат **Маскатаў** П. Г. уносіць прапанову залічыць у адзіны дзяржаўны бюджэт СССР бюджэт соцыяльнага страхавання, паколькі сродкі, утвараемыя ў гэтым бюджэце, з'яўляюцца дзяржаўнымі сродкамі і па свайму назначэнню яны цалкам накіроўваюцца на тыя-ж мэты і задачы, якія вырашае дзяржаўны бюджэт у галіне матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных мас. Совет Нацыянальнасцей аднагалосна прымае гэту прапанову.

Совет Нацыянальнасцей у парадку паартыкульнага чытання аднагалосна зацвярджае—па артыкулах, а затым і ў цэлым—«Закон аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год».

Па прапанове дэпутата **Варшкова** П. А. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — даклад аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым чацвёртае пасяджэнне Другой Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца. (БЕЛТА).

Прамова дэпутата Н. Я. НАТАЛЕВІЧА

ў спрэчках па дакладу аб Адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 г.

на пасяджэнні Совета Саюза 13 жніўня 1938 г.

Таварышы дэпутаты, на зацвярджэнне 2-й Сесіі Вярхоўнага Совета СССР Советам Народных Камісараў Саюза ССР унесен адзіны дзяржаўны бюджэт Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год.

Бюджэт нашай соцыялістычнай дзяржавы ў 1938 годзе па даходах дасягае каласальнай сумы — 125.184,2 млн. руб. Па расходах—123.684,2 млн. руб. Даход перавышае расход на 1.500 млн. руб. Такога магутнага бюджэта не мае ні адна капіталістычная краіна.

Запраектаваная сума адзінага дзяржаўнага бюджэта на 1938 год сведчыць аб устойлівасці совецкага рубля, аб фінансавай і гаспадарчай магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы, аб несакрушальнай сіле і магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы. У ажыццяўленні нашага дзяржаўнага бюджэта моцна ўпэўнены ўсе працоўныя вялікага Совецкага Саюза.

У нас ёсць усе магчымасці для яго выканання.

Матэрыяльныя рэсурсы нашай краіны каласальныя. Сілы і магчымасці вялікага совецкага народа бязмежны. Працоўныя нашай вялікай радзімы ясна ўяўляюць, што цвёрдае і няўхільнае выкананне дзяржаўнага бюджэта забяспечвае ажыццяўленне планаў вялікай соцыялістычнай будоўлі. Рэалізацыя ўнесенага на зацвярджэнне 2-й Сесіі Вярхоўнага Совета СССР дзяржаўнага бюджэта на 1938 год яшчэ ў большай меры палепшыць і павысіць дабрабыт працоўных, дасць магчымасць яшчэ ў большай ступені аснасціць навейшай баявой тэхнікай нашу слаўную, любімую і непераможную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію — вернага вартавога нашых совецкіх рубяжоў, дасць магчымасць на страх ворагам і на радасць прыяцелям яшчэ вышэй падняць боездольнасць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Працоўныя нашай краіны добра ведаюць, што кожны рубель і кожная капейка з совецкага дзяржаўнага бюджэта ідзе на справу соцыялістычнага будаўніцтва, на карысць вялікага совецкага народа. Вось чаму кожны грамадзянін Совецкага Саюза, як горды патрыёт сваёй радзімы, лічыць сваім доўгам і гонарам прыкласці ўсе намаганні к таму, каб садзейнічаць выкананню дзяржаўнага бюджэта на 1938 год.

Паспяховае ажыццяўленне совецкага дзяржаўнага бюджэта забяспечвае сістэма нашай соцыялістычнай дзяржавы, у перавагах якой даўно пераканаліся не толькі нашы прыяцелі, але і нашы ворагі. Некаторыя з гэтых ворагаў пераканаліся ў перавагах соцыялістычнай сістэмы на сваіх спінах.

Паспяховае ажыццяўленне дзяржаўнага бюджэта забяспечваецца мудрым кіраўніцтвам нашай слаўнай непераможнай партыі Леніна—Сталіна і асабіста вялікага і мудрага таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

У нашай партыі і совецкага ўрада няма іншых інтарэсаў, акрамя інтарэсаў совецкага народа. Таму адзіны дзяржаўны бюджэт на 1938 год, які ўносіцца нашым совецкім урадам на зацвярджэнне Другой Сесіі Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, выражае волю і спадзяванні ўсяго совецкага народа.

Паны капіталісты лічаць неабходным не ставіць пытання аб дзяржаўным бюджэце на абмеркаванне буржуазных парламентаў. Яны імкнуцца ўтоіць ад працоўных эксплаататарскі і паразітычны характар капіталістычнага бюджэта, гэтым самым прабуючы ўтоіць паразітычны характар самога капіталізма. Совецкаму ўраду няма чаго скрываць ад народа крыніцы даходнай часткі бюджэта і артыкулы яго расходнай часткі. Наадварот, совецкі ўрад выносіць на абмеркаванне і зацверджанне Вярхоўнага Совета СССР дзяржаўны бюджэт, каб увесь совецкі народ праз сваіх выбраннікаў — дэпутатаў Вярхоўнага Совета—абмеркаваў і зацвердзіў кожны артыкул даходаў і расходаў, каб кожны совецкі рубель эканомна і рацыянальна быў скарыстан у інтарэсах соцыялістычнага будаўніцтва, росквіту нашай радзімы і ўмацавання яе абароназдольнасці

Увесь многамільённы совецкі народ, як адзін чалавек, будзе змагацца за выкананне мерапрыемстваў, забяспечваючых выкананне нашага дзяржаўнага бюджэта. У гэтым перавага і сіла совецкага дэмакратызма, у гэтым перавага і моцнасць нашага дзяржаўнага бюджэта.

Запраектаваная даходная частка адзінага дзяржаўнага бюджэта Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год у суме 125.184,2 млн. руб. адлюстроўвае, як у люстры, усю веліч перамог рабочага класа і калгаснага сялянства, дасягнутых пад кіраўніцтвам слаўнай непераможнай партыі Леніна—Сталіна і нашага мудрага правадыра і настаўніка—вялікага Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Мы стварылі сваю цяжкую індустрыю, што дало нам магчымасць падвесці тэхнічную базу пад усе галіны народнай гаспадаркі, забяспечыць эканамічную незалежнасць ад капіталістычных краін, умацаваць абароназдольнасць совецкай краіны, зрабіць нашу радзіму непрыступнай крэпасцю, аб якую abламае зубы любы фашысцкі сабака, калі ўздумае парушыць недатыкальнасць нашых совецкіх граніц.

Мы сталі краінай соцыялістычнага земляробства. Нашы калгаснікі жывуць заможным, культурным, шчаслівым жыццём. Небывалага росквіту ў галіне культуры і мастацтва дасягнулі народы нашага многанацыянальнага Совецкага Саюза.

Наш СССР — краіна перадавой індустрыі, перадавой сельскай гаспадаркі, перадавой навукі і тэхнікі, краіна светлага, радаснага, культурнага, заможнага жыцця мільённых мас. Усімі гэтымі дасягненнямі і перамогамі совецкі народ абавязан партыі Леніна—Сталіна і мудраму правадыру, другу і настаўніку вялікаму Сталіну. **(Бурныя апладысменты).**

Штодзённыя клопаты нашай партыі і совецкага ўрада аб эканамічным і культурным развіцці нацыянальных рэспублік і абласцей знаходзяць сваё яркае адлюстраванне ў бюджэце Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі на 1938 год.

Бюджэт БССР на 1938 год складае 1.167.210 тыс. руб. Беларусь да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі не мела сваёй дзяржаўнасці. Значыцца, у той час не магло быць і гутаркі аб дзяржаўным бюджэце ў Беларусі. Багацці Беларусі — лясы, землі — належалі памешчыкам, князям і папам. Беларускі селянін вякамі гнуў спіну на польскіх і рускіх памешчыкаў, кулакоў і папоў, жыў у галечы, холадзе і голадзе. Зямля апрацоўвалася сахой і драўлянай бараной, хлеб пяклі напалову з мякінай і карой, і то хапала толькі да каляд.

Галеча і голад гналі беларускага селяніна на перасяленне. У адну Амерыку за 12 дарэволюцыйных год пераехала 80 тыс. чалавек, у Сібір перасялілася 642 тыс. чалавек.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя навекі пахавала памешчыкаў, капіталістаў і ўсіх эксплаататараў. Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя дала магчымасць разгарнуцца найвялікшым творчым сілам і здольнасцям беларускага народа. Не гледзячы на проіскі подлых ворагаў народа, прадажнай трацкісцка-бухарынскай і буржуазна-нацыяналістычнай зграі нямецкіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна і пры велізарнай дапамозе вялікага геройчнага рускага народа дабілася ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва выдатных поспехаў.

Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай з буйнай прамысловасцю і соцыялістычнай сельскай гаспадаркай. Там, дзе раней па полю цягнуў саху і драўляную барану захудалы і слабасільны конь, зараз працуе трактар і камбайн.

Беларусь стала квітнеючай ордэнаноснай рэспублікай. Совецкі Саюз забяспечыў для БССР няўхільны рост дзяржаўнага бюджэта і адпаведна высокія тэмпы развіцця соцыялістычнай прамысловасці.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці на тэрыторыі цяперашняй Беларусі ў 1913 годзе ў цэнах 1927 года складала 89 млн. руб. Аб'ём валавой прадукцыі ў 1937 г. — 2.100 млн. руб.

За годы двух сталінскіх пяцігодак Беларусь карэнным чынам змяніла свой твар. Цяпер у нас ёсць прамысловасць металаапрацоўчая, тарфяная, лясных будматэрыялаў, хімічная, паліграфічная, сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, станкабудаўніцтва, лёгкая і харчовая.

Запраектаваныя па бюджэту 1938 года расходы на развіццё прамысловасці БССР у суме 66 млн. руб. даюць магчымасць дасягнуць новых поспехаў і яшчэ больш умацаваць нашу пагранічную рэспубліку.

Некалькі слоў аб сельскай гаспадарцы. Ворагі народа, здраднікі нашай радзімы, польскія найміты шмат нашкодзілі ў сельскай гаспадарцы. Наша партыя, урад і органы НКВД на чале з слаўным сталінскім наркомам тав. Н. І. Ежовым, наш вялікі Сталін дапамаглі беларускаму народу выкрыць і знішчыць заклятых ворагаў народа і аказалі нам вялікую дапамогу ў перабудове сельскай гаспадаркі.

Да Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў Беларусі было 838.400 аднаасобных сялянскіх гаспадарак, 214.587 сох і 420.942 драўляныя бараны.

Цяпер у нас 9.964 калгасы, якія засяваюць 96,4 проц. усёй пасеўнай плошчы, 215 МТС з наяўнасцю 8.140 трактараў, 1.900 камбайнаў, 3.800 малацілак, 1.200 ільнацерабілак, 3.416 аўтамашын. Уся гэта тэхніка дапамагае беларускаму народу ў барацьбе за высокі ўраджай, за заможнае, шчаслівае, радаснае жыццё.

На соцыяльна-культурныя патрэбы намечана адпусціць для Беларускай ССР у 1938 годзе 830 млн. руб. супроць 685 млн. руб. у 1937 годзе, што дае рост у параўнанні з мінулым годам на 21,2 проц.

Да рэволюцыі 75 проц. насельніцтва Беларусі было непісьменным. Жанчын было непісьменных 90 проц. Затое ў Беларусі было 3 тыс. цэркваў, 704 сінагогі, 113 касцёлаў, 5 тысяч манапольк, 6 тысяч папоў, равінаў і ксяндзоў.

Царскі ўрад у 1914 годзе на народную асвету расходаваў каля 60 кап. на чалавека. Зараз у Беларусі расходуецца больш 100 рублёў на чалавека.

Беларусь зараз з'яўляецца рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У БССР ёсць 7.069 школ, у іх навучаецца 1.068.000 дзяцей працоўных; у 98 тэхнікумах вучыцца 32.976 студэнтаў; у 23 ВНУ — 14.626 студэнтаў. У школах працуюць 32.050 настаўнікаў. Кожны год з ВНУ і тэхнікумаў выпускаюцца тысячы маладых совецкіх спецыялістаў, актыўных будаўнікоў соцыялізма.

Толькі ва ўмовах краіны перамогшага соцыялізма магчым такі росквіт культуры, навукі і мастацтва.

Нястомныя клопаты партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў працоўных знаходзяць сваё яркае адлюстраванне ў расходнай частцы бюджэта на 1938 год.

У 1914 годзе на ахову здароўя па Беларусі царскі ўрад зрасходаваў 800 тыс. рублёў. У 1938 годзе па бюджэту БССР (не ўключаючы мясцовы бюджэт) намечана зрасходваць на ахову здароўя 69.964 тыс. руб. і на справу соцыяльнага забеспячэння — 32.322 тыс. руб.

З моманту выдання закона аб дапамозе многадзетным выдана дзяржаўнай дапамогі 55.212 тыс. рублёў.

Я цалкам і поўнасцю падтрымліваю прапанову выступаўшых дэпутатаў аб зацвярджэнні адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год у тым выглядзе, у якім ён прадстаўлен на разгляд Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР з улікам заўваг, якія ўнеслі дэпутаты.

У сваім дакладзе народны камісар фінансаў СССР тав. Зверэў справядліва і правільна крытыкаваў слабую дзейнасць фінансавых органаў БССР. Яго заўвага аб тым, што БССР адстае ў частцы паступлення даходаў па падатках і зборах з насельніцтва правільная.

Я лічу неабходным звярнуць увагу работнікаў Наркамфіна і асабіста тав. Зверэва на нездавальняючую работу апарата Наркамфіна па складанню матэрыялаў да бюджэта. У прыватнасці да гэтага часу не ўнесена яснасць у пытанне аб ліквідацыі прарыву ў абаротных сродках Наркаммясапрома БССР у суме 6 млн. руб. Пры звёрстванні фінансавага плана Наркамлеса Наркамфін СССР выключыў 4.692 тыс. руб. прылічваючыхся да звароту трэсту Лесбел па адлічэннях ад прыбыткаў за 1937 год.

Асталіся не ўдакладненымі таксама адлічэнні падатку з абароту і лічбы па ўпраўленчых расходах у сувязі з арганізацыяй у рэспубліцы абласцей.

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР праходзіць ва ўмовах выключна абвостранай міжнароднай абстаноўкі. Не спыняючыяся правакацыі з боку фашысцкіх агрэсараў і ў прыватнасці правакацыі японскайваеншчыны на нашых далёкаўсходніх граніцах сведчаць аб імкненні фашысцкіх дзяржаў уцягнуць нас у вайну. Праўда, усе гэтыя спробы разбіваюцца ўшчэнт аб несакрушальную сілу і магутнасць нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Але гэта ні ў якім выпадку не павінна нас супакойваць. Мы павінны яшчэ больш умацоўваць абароназдольнасць Совецкага Саюза, яшчэ больш павышаць баявую магутнасць Чырвонай Арміі. Вось чаму расходы на абарону нашай краіны у намечанай па праекту бюджэта суме 27 мільярдаў рублёў — дэпутаты беларускага народа сустракаюць з выключным адабрэннем.

Галасуючы за зацвярджэнне адзінага дзяржаўнага бюджэта на 1938 год у цэлым, галасуючы за бюджэтныя асігнаванні ў 27 млрд. руб. на абарону краіны, я думаю — не памылюся, калі скажу, што мы цалкам і поўнасцю выражаем гэтым самым волю нашых выбаршчыкаў, волю нашага вялікага совецкага народа. Наш народ гатоў у любую мінуту па заклiку нашай партыі і совецкага ўрада, па заклiку нашага вялікага Сталіна выступіць на абарону сваёй любімай радзімы-мацеры і разам з нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй знішчыць ўсякага ворага, які ўздумае пасягнуць на нашу незалежнасць, на нашу свяшчэнную зямлю, на нашу свабоду.

Няхай мацнее несакрушальная сіла і баявая магутнасць нашай непераможнай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі!

Няхай жыве наша Чырвоная Армія—верны вартавы совецкіх граніц!

Няхай жыве яе слаўны палкаводзец — Першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў! **(Усе ўстаюць і наладжваюць бурную авацыю ў гонар таварыша Варашылава. Воклічы: «Няхай жыве Першы маршал Совецкага Саюза, жалезны нарком таварыш Варашылаў!»).**

Няхай мацнее абароназдольнасць і магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы на страх ворагам і на радасць нашым прыяцелям!

Няхай жыве вялікі геній чалавецтва, наш правадыр і настаўнік — мудры і вялікі Сталін! **(Усе ўстаюць і наладжваюць бурную, доўга незмаўкаючую авацыю ў гонар таварыша Сталіна).**

УРАДАВАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ЭКІПАЖЫ САМАЛЁТА Н-209

Год таму назад, 12 жніўня 1937 года, з дазволу Совецкага Урада, Герой Совецкага Саюза лётчык **С. А. Леванеўскі** пачаў пералёт з Масквы цераз полюс у Паўночную Амерыку на чатырохматорным самалёце Н-209. Мэтаю пералёту было пасля бліскучых палётаў тт. Чкалава і Громава, зробленых у тым-жа годзе, выпрабаваць сувязь праз Паўночны полюс з Амерыкай на самалёце паштова-пасажырскага тыпу. Экіпаж самалёта Н-209 складаўся з 6 таварышоў: С. А. Леванеўскі — камандзір самалёта, Н. Г. Кастанаеў — пілот, В. І. Леўчанка — штурман, Г. Т. Пабежымаў і Н. Н. Гадавікоў — механікі, Н. Я. Галкоўскі — радыст.

Палёт адбываўся ў вельмі цяжкіх метэаралагічных умовах, асабліва над Ледавітым акіянам. Апасаючыся абледзянення, лётчыкі трымаліся на вялікай вышыні, але і там не выходзілі з воблакаў. 13 жніўня ў 13 гадзін 40 мінут самалёт Н-209 прайшоў над Паўночным полюсам, а ў 14 гадзін 32 мін. з борта самалёта была падана радыёграма з паведамленнем, што адзін з матораў спыніўся. Гэтая акалічнасць, прымушаючы самалёт ляцець ніжэй, павялічвала небяспеку абледзянення.

На гэтым сувязь з самалётам абарвалася. Мноства палярных і іншых радыёстанцый безупынна сачыла за ім, але работа станцыі самалёта Н-209 не была выяўлена.

Хаця на думку кампетэнтных спецыялістаў уся абстаноўка ўказвала на тое, што адбылася катастрофа ў паветры і самалёт напэўна разбіўся, а не зрабіў пасадку, Урад СССР арганізаваў росшукі экіпажа самалёта Н-209 па ўсёй трасе яго палёту, як са стараны берагоў СССР, так і са стараны берагоў Аляскі і Паўночнай Канады. За час расшукванняў было вроблена два палёты да Паўночнага полюса, рад палётаў на аддегласці трасы ў старану Амерыкі, палёт з Зямлі Франца-Іосіфа да берагоў Грэнландыі (куды дрэйф мог аднесці астаткі самалёта) і іншыя. Палёты не далі рэзультатаў, самалёт Н-209 не быў знойдзен.

Урад апрасіў Герояў Совецкага Саюза — лётчыкаў і палярных даследчыкаў — аб магчымасці і мэтазгоднасці далейшых пошукаў. Па водле аднадушнай іх думкі далейшыя пошукі не маюць ніякіх шансаў на поспех і экіпаж самалёта Н-209 трэба лічыць загінуўшым.

У сувязі з гэтым Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў далейшыя пошукі самалёта Н-209 спыніць.

Урад СССР падзяляе з усім совецкім народам смутак аб утраце нашых дарагіх таварышоў, мужных совецкіх лётчыкаў, таварышоў С. А. Леванеўскага, Н. Г. Кастанаева, В. І. Леўчанкі, Г. Т. Пабежымава, Н. Н. Гадавікова і Н. Я. Галкоўскага і выказвае сем'ям іх сваё глыбокае спачуванне.

Урад пастанавіў:

1. Для ўвекавечання памяці таварышоў С. А. Леванеўскага, Н. Г. Кастанаева, В. І. Леўчанкі, Г. Т. Пабежымава, Н. Н. Гадавікова і Н. Я. Галкоўскага пабудаваць помнік у г. Маскве.

2. Прысвоіць:

імя т. **Леванеўскага** — школе марскіх лётчыкаў у г. Нікалаеве і ледакольнаму параходу, што будуецца;

імя т. **Кастанаева** — аэрадрому і лётна-выпрабавальнай станцыі пры заводзе № 22;

імя т. **Леўчанкі** — авіяцыйнаму палку Балтыйскага флота;

імя т. **Пабежымава** — Краснаярскаму авіярамонтнаму заводу Галоўпаўночморшляху;

імя т. **Гадавікова** — Маскоўскаму авіяцыйнаму тэхнікуму НКОП;

імя т. **Галкоўскага** — Якуцкаму радыёцэнтру Галоўпаўночморшляху.

Урад пастанавіў назначыць сем'ям загінуўшых членаў экіпажа самалёта Н-209 пенсію ў павышаным размеры і выдаць сем'ям загінуўшых адначасовую дапамогу па 20.000 рублёў кожнай сям'і.

На сходзе мастакоў Менска

Арудаваўшыя ва Упраўленні па справах мастацтваў шкоднікі ўсякімі сродкамі імкнуліся затармазіць рост мастацтва Совецкай Беларусі. На жаль і на сёння, рашучых змен у кіраўніцтве справамі мастацтва яшчэ не наступіла. Гэта ў прыватнасці красамоўна паказаў гарадскі сход менскіх мастакоў (11 жніўня).

Упраўленне па справах мастацтваў толькі зараз паставіла перад мастакамі пытанне аб іх удзеле ў мастацкім афармленні беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Да гэтага ворагі народа ўсяляк ігнаравалі беларускіх мастакоў, адначасова зрываючы выкананне дагавораў на мастацкія работы для павільёна ленінградскімі мастакамі. На сходзе высветлілася, што дагаворы на работы для павільёна трэба заключыць нанава.

Выступіўшыя на сходзе мастакі і скульптары — Керзін, Азгур, Волкаў і іншыя — з вялікім абурэннем справядліва гаварылі аб прадаўжаючымся недавер'і некаторых работнікаў з Упраўлення па справах мастацтваў і выставачнага камітэта да беларускіх мастакоў. Мастакі аднадушна заявілі, што работу па афармленню павільёна яны лічаць справай свайго гонару, і з радасцю возьмуцца за гэтую работу. Сход вылучыў камісію для дэтальнай распрацоўкі каштарыса і плана мастацкіх работ для павільёна.

Сход мастакоў аднадушна вырашыў прыняць удзел у рыхтуемай Усесаюзнай мастацкай выстаўцы, прысвечанай 20-годдзю слаўнага ленінска-сталінскага комсамола. Намечан папярэдні спіс, прыкладна, 40 мастацкіх работ для гэтай выстаўкі.

Абмеркавалі мастакі таксама пытанне і аб канферэнцыі беларускіх мастакоў. Канферэнцыю пастаноўлена склікаць 20 верасня для абмеркавання на ёй творчых і арганізацыйных пытанняў саюза.

А. Д.

Пахаванне К. С. Станіслаўскага

Гроб з целам Канстанціна Сяргеевіча быў устаноўлен у памяшканні МХАТ, партэр якога быў вызвален ад крэслаў; зала, сцэна былі дэкарыраваны чырвоным аксамітам, задрапіраваным чорным, на якім вылучалася эмблема МХАТ — чайка. Мяккія гукі сімфанічнага аркестра, велізарная колькасць вянкоў, жывыя кветкі, пальмы і сярод іх узвышаецца белы атласны гроб з целам Канстанціна Сяргеевіча. Святло пражэктараў асвятляе так добра ўсім знаёмы, цудоўны твар найвялікшага мастака совецкага мастацтва. Наперадзе гроба, на падушках два ордэны Канстанціна Сяргеевіча.

Наша дэлегацыя паклала вянок ад БССР, і затым мы ўсе стаялі ў ганаровай варце, змяніўшы дэлегацыю ад Вялікага тэатра. Бясконцай веранінай каля гроба ідуць прышоўшыя ў апошні раз паглядзець выдатнага актора, надзвычайнага рэжысёра, які аддаў усё сваё яркае жыццё рускаму мастацтву. У 15 гадзін цела з гробам вынеслі з МХАТ і жалобная працэсія накіравалася да Нова-Дзевічых могілак. Магіла Станіслаўскага прыгатавана ў вішнёвым садзе, побач з Чэхавым, Гогалем, Сабінавым, недалёка ад сына М. Горкага. На могільніку на жалобным мітынгу выступіў ад урада тав. Булганін, затым Немірові́ч-Данчанка, Качалаў, рабочы тав. Малькоў і вучань Станіслаўскага ад опернага тэатра яго імені. Пры развітванні з целам артысты МХАТ пакляліся няўхільна ісці і працаваць на тэатры так, як вучыў іх Канстанцін Сяргеевіч, каб мастацкая праўда стала здабыткам народнага совецкага тэатра, стала здабыткам сусветнай сцэны. Пад гукі жалобнага марша цела Станіслаўскага апусцілі ў магілу.

Маладое совецкае мастацтва беражліва панясе ў свае школы і тэатры бліскучую працу вялікага мастака Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага, які на працягу поўстагоддзя быў сцягам прагрэса ў мастацтве, сцягам барацьбы з коснасцю, руцінай, штампам — за прастату і праўду ў мастацтве.

П. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.
Засл. арт. БССР.

ВЯЛІКІ МАСТАК І МЫСЛІЦЕЛЬ

Радыёхваля ахутала душу сумнай весткай аб смерці вялікага настаўніка і натхніцеля тэатра—Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага.

Не верыцца, што гэтага надзвычайнага мастака і майстра сцэны больш няма сярод нас.

З'яўляючыся асновапаложнікам тэатральнай сістэмы, Канстанцін Сяргеевіч усё сваё жыццё імкнуўся ў сваім вывучэнні да глыбокага і праўдзівага ўзнаўлення рэчаіснасці, да смелай мыслі, да высокага ўзлёту творчай фантазіі, да сапраўднага творчага стану.

Станіслаўскі да канца дзён сваіх нястомна прадоўжваў паглыбляць і ўдасканальваць сваю славутую тэатральную сістэму, змагаючыся з штампамі, фокусніча́ннем і тэатральным рамесніцтвам. Стваральнік і арганізатар МХАТ, Станіслаўскі згуртаваў у гэтым выдатным арганізме выдатных акцёраў-мастакоў, якія з'яўляюцца гонарам усяго нашага Совецкага Саюза, — актораў-майстроў сусветнага значэння.

Свой найбагацейшы вопыт Станіслаўскі ўсё жыццё перадаваў вучням, акторам, ён пакінуў нам у спадчыну свае надзвычайныя працы: «Маё жыццё ў мастацтве» і «Работа актора».

Адухоўлены вобраз вялікага тэатральнага генія Станіслаўскага назаўсёды застанецца сімвалам і заклікам да творчага натхнення, да культуры і да радасці працы.

Гаворачы аб Станіслаўскім, успамінаеш словы другога вялікага майстра сцэны—Е. Б. Вахтангава: «Жыццё сваё трэба пражыць выдатна, а калі можна, дык і таленавіта».

М. Б. СОКАЛ,
артыст Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра.

ДА ДНЯ АВІЯЦЫІ 18 ЖНІЎНЯ
НА ЗДЫМКУ: атрад спартыўных самалётаў камандзіра атрада А. А. ЯСТРАБАВА ў паветры. (СФ).

З ПАЭМЫ «РАДЗІМЕ І ПРАВАДЫРУ». Музыка М. ІВАНОВА.

Беларуская краіна

Беларуская краіна,
Твой шырокі шлях!
Над табой у зорнай сіні
Палымнее сцяг.

Гэта ты ўпартай воляй
На прастор і шыр
Вывеў нас з былой няволі,
Мудры правадыр.

І цвіце мой край чароўных
Пушчаў і азёр
У сям'і свабодных, роўных
Маладых сясцёр.

Гэта ты рукою дужай
Даў народам мір,
Нас навек з'яднаўшы дружбай,
Мудры правадыр.

І ніякія напасці
У самы трудны час
Не парушаць долі-шчасця,
Не падзеляць нас.

Мы ідзем адной калонай,
Бурнаю, што вір.
Пад зарой твайго Закона,
Мудры правадыр.

І сабраўшыся на першы
Незвычайны сход,
У Совет сыноў найлепшых
Выбера народ.

Ты да новай перамогі
На прастор і шыр
Нам паказваеш дарогі,
Мудры правадыр.

І. ПРАЎДЗІН

СЮРПРЫЗ

(НАВЕЛА)

Фёдар Шчэглоў упершыню за два гады сямейнага жыцця пашкадаваў, што ён рана ажаніўся.

— Не паспеў-бы ў дваццаць пяць год, ці што? І Рома пачакала-б... Два гады — тэрмін невялікі... Затое ніхто-б мне цяпер не перашкаджаў...

Але тут-жа сам сябе вылаяў за такую думку.

— Што значыць, «не перашкаджаў»? А хіба цяпер табе хто перашкаджае? А калі-б Рома ведала — няўжо яна перашкодзіла-б? Наадварот. Рома ніколі не трусіла і цяпер-бы не струсіла...

— Чаму-ж табе не расказаць ёй аб усім? — спытаў ён сам у сабе.—Яна цябе толькі пахваліць, ды яшчэ ганарыцца будзе. Яна з задаволеннем раскажа ўсім сяброўкам па фабрыцы, які яе Федзя малайчына — скочыў з парашутам...

— Так... А раптам яна хваляваціца будзе... Асабліва ў дзень прыжка, — зноў падумаў ён. — Я то ў сябе ўпэўнены. Тэорыю вывучыў на выдатна. Тэарэтычна я прыгаў ужо дзесяткі разоў і добра сабе ўяўляю, як усё гэта робіцца. Вылезу на крыло, вазьмуся рукой за кальцо, па камандзе кінуся ўніз, адлічу тры секунды, тузану за кальцо і—усё ў парадку. Нават у сне я прыгаў некалькі разоў... Не, прыжок — гэта глупства. Нічога дзіўнага і нічога страшнага няма. Але вось, Рома... Як ёй аб гэтым сказаць... Да прыжка засталося сем дзён, і яна сем начэй вочы не заплюшчыць... Такая ўражлівая яна...

Так раздумваў Фёдар Шчэглоў, вяртаючыся з завода дамоў пасля работы, і ніяк не мог вырашыць: сказаць ці не сказаць жонцы аб прадстаячым прыжку з парашутам.

Фёдар вельмі любіў сваю Рому. Перад жаніцьбай яны гулялі месяцы з тры. За гэты час яны даволі добра сышліся характарам. Федзя ведаў, што Рома тры гады працуе на фабрыцы. Яна стаханаўка, актыўная комсамолка, а ў фабрычным хоры — першы запявала. І сям'я Ромы яму спадабалася. Бацька — токар па металу, маці —хатняя гаспадыня, брат — камандзір Чырвонай Арміі. Адным словам — совецкая інтэлігентная сям'я.

Федзя таксама спадабаўся ім. Кваліфікаваны слесар. Чатыры гады ў комсамоле. Нядаўна прышоў з Чырвонай Арміі. Там ён фізічна развіўся і вырас палітычна. Федзя вельмі добра разбіраўся ў міжнародных пытаннях і часценька талкова растлумачваў маці Ромы — Надзеі Васільеўне — куды гне фашысцкая Германія, чаго хоча самахвал «япошка» і чаму яны абавязкова скруцяць сабе шыю, калі асмеляцца напасці на Совецкі Саюз.

Звычайна пасля такое размовы маці Ромы запрашала Федзю да стала і даставала з буфета сваё самае любімае варэнне — чорную смародзіну, і Федзю так спадабалася яно, што не раз прасіў — падрабязна апісаць яму рэцэпт варкі. Тады Надзея Васільеўна хітравата ўсміхалася, ківала галавой у бок Ромы і на вуха яму шаптала:

— Запытайцеся ў яе, яна ўсё знае...

Пасля гэтага ўсіх трох апаноўваў гамерычны смех і Рома жартліва прасіла мацеру не шаптацца з Федзям.

Яшчэ больш утульна і весела адчуваў сябе Федзя, калі ў часе яго візіту прыходзіў бацька Ромы — Сямён Якаўлевіч, стары заводскі рабочы, вылучаны нядаўна начальнікам цэха. Ен часта заседжваўся ў дырэктара на вытворчых нарадах і прыходзіў задумённы, стомлены. Апынуўшыся сярод моладзі, ён у момант змяняўся, весела жартаваў, смяяўся, успамінаў сваю маладасць, расказваў цікавыя гісторыі аб сутычках з заводчыкам, у якога ён калісь працаваў, аб сутычках з царскай паліцыяй, аб штрэйкбрэхерах...

— Надзвычайны, выдатны старык, — думаў аб ім Федзя, слухаючы яго жывыя, цікавыя апавяданні. — З такім прыемна парадніцца.

Такім чынам, калі пад канец трэцяга месяца знаёмства Федзя прапанаваў Роме пайсці за яго замуж і яна папрасіла тры дні на абдумванне, ён сустрэў аднадушную падтрымку абодвух старых. Так ён атрымаў перамогу.

З кожным днём Федзя ўсё больш упэўніваўся, што Рома — сапраўдны таварыш, разумная, разважлівая, «вытрыманая», як ён часта гаварыў. З кожным днём ён любіў сваю сяброўку жыцця ўсё больш і захапляўся ёю, як бацька сваім дзіцем. Гэтыя пачуцці знаходзілі чуткі водгук у Ромы, і ёй здавалася, што хлопца, лепшага за яе Федзю, не знайсці...

— Як-жа быць, — думаў тым-часам Федзя, — сказаць ці не сказаць?..

Думкі яго ляцелі, абганяючы адна адну, сутыкаліся, знікалі і зноў паяўляліся, а ён ніяк не мог прысці да канчатковага рашэння.

Першую памылку Федзя дапусціў, калі ён утоіў ад Ромы, што пачаў наведваць парашутны гурток. «Палітгурток наведваю» — схлусіў ён. Яму тады здавалася, што гурток не закончыць сваёй праграмы, разваліцца, як нядаўна развалі́ўся гурток па вывучэнню англійскай мовы. «Пораху ў рэбят не хопіць, — думаў ён, — чаго-ж дарма хваляваць Рому». Але апаскі яго не апраўдаліся. Парашутны гурток працаваў, авалодаў тэорыяй і цяпер рыхтаваўся заняцца практыкай...

— Так, гэта была памылка, — цвёрда сказаў сабе Федзя. — Трэба было адразу ўсё выкласці...

— Але што-ж рабіць цяпер?..

З гэтым пытаннем Федзя адчыніў дзверы сваёй кватэры і тут-жа, на парозе, рашэнне ў яго наспела канчаткова:

— Не, нічога не скажу, зраблю ёй... сюрпрыз.

***

Была ясная сонечная веснавая раніца. Федзя ў камбінезоне, з двума парашутамі (адным запасным) залез у кабіну самалёта. Ен нешта крыкнуў таварышам па гуртку, але трэск матора заглушыў яго голас. Самалёт хутка пабег па зялёнаму полю. Вось ён пачаў ужо набіраць вышыню, а Федзя нават не заўважыў, як самалёт адарваўся ад зямлі. Толькі замільгаўшыя ўнізе домікі і ангары, падобныя на нейкія цацкі, далі яму зразумець, што ён ужо высока. Як здзівіцца Рома, даведаўшыся аб яго прыжку! — падумаў, усміхнуўшыся, Федзя. У гэты момант лётчык павярнуўся да Федзі і, убачыўшы ўсмешку на яго твары, пахвальна махнуў яму рукой.

Затым усё адбылося так, як Федзя сабе гэта ўяўляў. Ен вылез на крыло самалёта, узяўся рукой за кальцо парашута і па знаку лётчыка скочыў... На імгненне ў Федзі замерла сэрца. Але гэта доўжылася толькі адну секунду.

— Раз, два, тры, — адлічыў Федзя і тузануў кальцо. Моцны рывок крыху збянтэжыў яго, але падняўшы галаву і ўбачыўшы над сабою белы купал парашута, ён радасна засмяяўся і на ўвесь голас заспяваў прыпеў любімай песні:

Все выше, выше и выше
Стремим мы полет наших птиц,
И в каждом пропеллере дышит
Спокойствие наших границ.

Ён не паспеў налюбавацца выдатнай панарамай, як зямля наблізілася да яго, і Федзя, крыху пацягнуўшыся, крануўся нагамі зялёнай травы і прызямліўся так, як вучыў яго інструктар...

Праз гадзіну, весела крочачы, падыходзіў Федзя да свайго дома. Атрыманы ім значок парашутыста ён паклаў у кішэню і штохвіліну правяраў, ці там ён.

Быў дзень адпачынку. Рома чакала яго, каб пайсці з ім у атэлье мод—заказаць сабе летні касцюм.

— Ну-с, — прамовіў Федзя, абдымаючы Рому за плечы, — можаш мяне павіншаваць... Толькі-што скочыў з парашутам...

Рома рэзка павярнулася да яго і недаверліва паглядзела яму ў вочы.

— Упаў з драбіны?

— Ды не, чэснае слова, толькі-што прыгаў...

— Ты?.. з парашутам?..

— Ну, так...

Твар Ромы збялеў і яна схапілася рукой за сэрца.

— Як? Ты прыгаў?!

— Так, так, прыгаў, — радасна адказаў Федзя. — І ўяві сабе — ні капелькі страху... Я раней думаў папярэдзіць цябе, але потым рашыў, што не варта. Ты-б дарма хвалявалася. А ты ведаеш, як я цябе люблю, і тваё хваляванне пазбавіла-б мяне спакою. Ну, дай я цябе пацалую...

— Пачакай, — адштурхнула яго Рома,—што-ж гэта за каханне, калі ты хаваеш ад мяне такія рэчы? Ці-ж так кахаюць?

— Але разумей... ты-б хвалявалася, начэй не дасыпала. А раптам...

— Раптам, раптам, — перадражніла яго Рома, і твар яе абліўся агнём.— — Два гады жывем з табой, а ты мяне дагэтуль не ведаеш... Так, так ты мяне не ведаеш. Я таксама паехала-б з табой на аэрадром, я-б табе дапамагла адзець парашут, я-б... я-б...

І Рома, не вытрымаўшы, заплакала ад вялікай крыўды.

Федзя стаяў, апусціўшы рукі, і апраўдваўся:

— Ромачка, супакойся, не плач, мілая, я-ж баяўся за цябе... Думаў — хвалявацца будзеш... Я здурэў, разумееш.. Выбачай... Гэта была памылка... Ну, не плач-жа, выбачай...

Доўга ўпрошваў Федзя, запэўняў, што больш не будзе гэтага, што ўсё будзе ёй расказваць, што нічога не схавае ад яе. Нарэшце, ён дастаў з кішэні значок парашутыста і пачаў растлумачваць, што на ім паказана.

Рома перастала плакаць і, павярнуўшы да яго заліты слязамі твар, патрабавала, каб ён расказаў усе падрабязнасці свайго прыжка.

Абняў ён жонку і пачаў расказваць. Калі Федзя выкладваў усе падрабязнасці, твар Ромы ўсё больш і больш ажыўляўся і нарэшце загарэўся яркім румянцам.

— Ах, як усё гэта добра! — усклікнула яна. — І ты ніколечкі не баяўся?

— Кажу-ж—не, — запэўніў ён,—ніколькі...

— Малайчына, Федзя! — заявіла яна і моцна пацалавала яго.

— Але глядзі,—прыгразіла яна яму пальцам, — ніякіх таямніц...

— У першы і апошні раз,—запэўніў яе Федзя.

***

У наступны дзень у мясцовай газеце з'явілася заметка аб новай групе парашутыстаў. Сярод лепшых было названа імя Федзі Шчэглова. У цэху, дзе працавала Рома, заметка нарабіла шмат шуму. Сяброўкі ўсё бегалі да Ромы — павіншаваць яе і распытаць падрабязнасці.

— Ды кіньце мяне віншаваць, — ужо раззлавалася Рома. — Што за дзіва! Скочыў з парашутам! Ды на ўсіх заводах — дзесяткі парашутыстаў. Толькі ў нас на фабрыцы няма ні аднаго...

І тут у Ромы мільганула думка... Яна схапіла за руку суседку па станку і ўсклікнула:

— А ведаеце што?! Нам таксама трэба арганізаваць гурток парашутыстаў...

— Правільна! — адказала сяброўка.— Як гэта мы раней не здагадаліся?..

***

Прайшло тры месяцы. Жыццё цякло паранейшаму. Федзя прыгаў яшчэ некалькі разоў, атрымаў значок парашутыста другой ступені. Потым ён узяўся за вывучэнне планернай справы і хутка стаў добрым планерыстам. Рома таксама была больш занята. Яна, як упэўніла Федзю, наведвала гурток кройкі і шыцця і вечарамі рэдка бывала дома...

Але вось аднаго разу (таксама ў дзень адпачынку) Федзя чакаў жонку. Яна ўстала вельмі рана,—сказала, што ўмовілася з сяброўкаю наведаць хворую работніцу.

Раптам адчыніліся дзверы і Рома ўляцела ў пакой, запыхаўшыся.

— Федзя, мілы! — усклікнула яна і сарваўшы яго з месца, закруцілася з ім па пакою.

— Федзя, дарагі, можаш мяне павіншаваць...

— З чым? Няўжо выграла па пазыцы?

— Ха-ха-ха! Па пазыцы!! Я скочыла, разумееш, скочыла з парашутам...

Федзя аслупянеў.

— Як!?. І... і... ты?..

— Ну але, я, я... Ура! Федзечка! А як цудоўна! Разумееш... Узышла на крыло і хоць-бы капельку страху... Гоп!—і я ўніз галавой. Перавярнулася,— хвоць за кальцо і—гатова справа. Надзвычайна!.. Ды што ты маўчыш? Давай пацалую...

— Ах ты... ах ты... страказа!.. Глядзі ты на яе... А чаму мне нічога не сказала?

—Глупства, Федзечка, глупства... Я думала, ты будзеш хвалявацца... Я паўтарыла тваю-ж памылку... Але парашыла зрабіць табе сюрпрыз... Ты мне выбачай...

— Добра, добра-ж... Вока за вока, зуб за зуб...

— Не, не, я не хацела табе адпомсціць... Чэснае слова...

— Добра, веру... — мякка адказаў Федзя.

І, памаўчаўшы крыху, дадаў:

— А ведаеш што? Паедзем на аэрадром. Я пакатаю цябе на планеры...

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Телефон 25-394.

Уп. Галоўлітбелу № К—5577.